СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК

# АБІТУРЫЕНТ-99

# Гродзенскі універсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года • № 5 (266) • 18 чэрвеня 1999 года, пятніца

Выходзіць адзін раз на месяц • Распаўсюджваецца бясплатна



## ПАВАЖАНЫЯ АБІТУРЫЕНТЫ!



**Высакародную місію выконвае універсітэт у рэгіёне. Ён забяспечвае вышэйшую адукацыю і грунтоўную падрыхтоўку спецыялістаў-прафесіяналаў, неабходных грамадству сёння і ў перспектыве, здольных хутка адаптавацца да зманяючагася асяроддзя і ўплываць на сацыяльнае і тэхналагічнае развіццё грамадства.**

**Універсітэт нацэлены на задавальненне культурных і духоўных патрабаванняў, якія звязаны з адукацыяй і самаадукацыяй, рэалізацыяй унутранага патэнцыялу асобы. Універсітэт імкнецца стаць рэгіянальным цэнтрам адукацыі, навукі і культуры і дасягнуць высокага ўзроўню як выкладання, так і навукі, разумеючы, што абодва кірункі дзейнасці ўзаемазалежныя.**

**Сёння універсітэт гасцінна расчыніў свае дзверы перад выпускнікамі сярэдніх школ, ліцэяў, гімназій, тэхнікумаў, коледжаў і вучылішчаў. Хачу пажадаць Вам, паважаныя абітурыенты, поспехаў на ўступных экзаменах. Верыцца, што самыя старанныя, таленавітыя і мэтанакіраваныя стануць студэнтамі.**

**Поспехаў Вам!**

*Рэктар*
*прафесар МАСКЕВІЧ*
*Сяргей Аляксандравіч.*

## ПРАХАДНЫ БАЛ НА ДЗЁННУЮ ФОРМУ НАВУЧАННЯ ЗА МІНУЛЫЯ ГАДЫ

| № п/п | Спецыяльнасць | 1996 г. | 1997 г. | 1998 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1. | Англійская мова і сучасныя зам.мовы | 12,5 | 18(17,5) | 17,5(17) |
| 2. | Біялогія | 10,5 | 9 | 10,5 |
| 3. | Беларуская мова і літаратура | 15,5 | 15 | 12 |
| 4. | Выяўленчае мастацтва і чарчэнне | 15,5 | 20 | 19,5 |
| 5. | Гісторыя | 11 | 11,5 | 12 |
| 6. | Гісторыя з дад.спец. англ. мова | - | - | 12(11,5) |
| 7. | Гісторыя з дад.спец. нямецкая мова | - | - | 11(10,5) |
| 8. | Камерцыйная дзейнасць | - | 10,5 | 12 |
| 9. | Класічныя мовы і антычная літаратура | - | - | 10,5 |
| 10. | Матэматыка | 11 | 11 | 10,5 |
| 11. | Музыка і спевы | 13,5 | 15,5 | 13 |
| 12. | Народная творчасць | 11 | 14 | 13 |
| 13. | Нямецкая мова | 12,5 | 17(16,5) | 17,5 |
| 14. | ПіМПН з дад.спец.музыка і спевы | 9,5 | 12 | 12,5 |
| 15. | ПіМПН з дад.спец. сац.педагогіка | 12,5 | 11,5 | 11 |
| 16. | ПіМПН з дад. спец. выяўленч.маст. | 10 | 12 | 15,5 |
| 17. | Правазнаўства | 12,5 | 12,5 | 12,5 |
| 18. | Праграмнае забесп. інфарм.тэхнал. | 12,5 | 12 | 14(13,5) |
| 19. | Прыборабудаванне і ТіАВПАН | 10,5 | 10,5 | 10 |
| 20. | Прыкладная матэматыка | - | - | 11 |
| 21. | Псіхалогія | 13 | 11,5 | 12 |
| 22. | Руская мова і літаратура | 13 | 11 | 10,5 |
| 23. | Славянскія мовы і літаратуры | 13,5 | 14 | 11,5(11) |
| 24. | Сусветная эканоміка і МЭА | 17 | 13 | 13 |
| 25. | Фізічная культура і спорт | 15 | 16,5 | 17,5 |
| 26. | Фізіка і радыёфізіка | 10,5 | 10,5 | 11,5 |
| 27. | Французская мова | 12,5 | 14 | 13,5 |
| 28. | Экалогія | 10,5 | 9 | 11,5 |
| 29. | Эканамічная кібернетыка | 13 | 11 | 12,5 |
| 30. | Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве | | | 12,5 |

# ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

## АДДЗЯЛЕННЕ РАМАНА-ГЕРМАНСКАЙ ФІЛАЛОГІІ

**г. Гродна, вул. Э. Ажэшкі, 22, тэл. 44-84-85**

*Загадчык аддзялення рамана-германскай філалогіі:*

***дацэнт СЕРАДА Людміла Міхайлаўна***

Аб папулярнасці менавіта гэтага аддзялення сведчыць традыцыйна высокі конкурс абітурыентаў. І гэта невыпадкова. Падрыхтоўка, атрыманая на аддзяленні рамана-германскай філалогіі, дазваляе яго выпускнікам пасляхова займацца не толькі педагагічнай і перакладчыцкай, але і мастацка-крытычнай і навуковай дзейнасцю ў галіне лінгвістыкі і краіназнаўства.

Падтрымліваць высокі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў аддзяленню дазваляюць цесныя сувязі з Брытанскім Саветам, Інфармацыйным Цэнтрам Пасольства ЗША, Гётэ Інстытутам у Мінску, Пасольствам Францыі, Еўрапейскай Асацыяцыяй Міжнароднай Адукацыі, плённае супрацоўніцтва з вучэбнымі і навуковымі цэнтрамі Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга.

Навуковыя канферэнцыі і семінары па пытаннях лінгвістыкі, культуралагічных аспектах і сучасных методыках выкладання моў, якія праводзяцца на аддзяленні, вядомыя ў навуковых колах не толькі краін СНД, але і далёкага замежжа.

На аддзяленні ствараюцца ўсе ўмовы для якаснага авалодання студэнтамі замежнай мовай, у тым ліку выкладанне носьбітамі мовы з дальняга замежжа, арганізацыя замежных працоўных практык, экскурсій і іншыя кантакты з носьбітамі мовы, якая вывучаецца. На аддзяленні рамана-германскай філалогіі навучаюцца 554 студэнты дзённай формы навучання, з іх 395 за кошт бюджэтных сродкаў фінансавання пад кіраўніцтвам 10 дацэнтаў і 80 выкладчыкаў.

Пасяджэнні «Клуба цікавых сустрэч», «Англійскага клуба», ядро якога складаюць студэнты аддзялення, збіраюць шырокае кола тых, хто актыўна цікавіцца культурай і традыцыямі нашай краіны і англамоўных народаў.

## КОНКУРС
### ЗА АПОШНІЯ ГАДЫ

| № п/п | Назва спецыяльнасці | Конкурс 1997 год | Конкурс 1998 год |
|---|---|---|---|
| 1. | Англійская мова і сучасныя замежныя мовы | 2,57 | 2,18 |
| 2. | Біялогія | біял., экал. 1,41 | 1,93 |
| 3. | Беларуская мова і літаратура | 2 | 2,58 |
| 4. | Выяўленчае мастацтва і чарчэнне | 2 | 2,3 |
| 5. | Гісторыя | гіст., культ. 2,21 | 2,62 |
| 6. | Гісторыя з дад.спец. англійская мова | | 2,4 |
| 7. | Гісторыя з дад.спец. нямецкая мова | - | 1,7 |
| 8. | Камерцыйная дзейнасць | 2,12 | 3,7 |
| 9. | Класічныя мовы і антычная літаратура | - | 1,8 |
| 10. | Матэматыка | 1,87 | 1,52 |
| 11. | Музыка і спевы[1] | 1,8 | 1 |
| 12. | Народная творчасць | 1,5 | 1,1 |
| 13. | Нямецкая мова | 1,67 | 1,84 |
| 14. | ПіМПН з дад.спец. музыка і спевы | 0,67 | 1,43 |
| 15. | ПіМПН з дад.спец. сац.педагогіка | 1,94 | 2,05 |
| 16. | ПіМПН са спецыялізац. выяўленчае мастацтва | 1,08 | 2,13 |
| 17. | Правазнаўства | 5,3 | 3,88 |
| 18. | Праграмнае забеспячэнне інфарм.тэхнал. | 2,32 | 1,6 |
| 19. | Прыборабудаванне і ТіАВПАН | фіз.-тэхн. 1,43 | 1.28 |
| 20. | Прыкладная матэматыка | - | 1,95 |
| 21. | Псіхалогія | 2,69 | 2,97 |
| 22. | Руская мова і літаратура | 1,68 | 1,44 |
| 23. | Славянскія мовы і літаратуры | 1.95 | 2,6 |
| 24. | Сусветная эканоміка і МЭА | 3,28 | 2,7 |
| 25. | Фізічная культура і спорт | 2,13 | 2,21 |
| 26. | Фізіка і радыёфізіка | фіз.-тэхн. 1,43 | 1,24 |
| 27. | Французская мова | 1.5 | 1,3 |
| 28. | Экалогія | біял.,экал. 1,41 | 2,27 |
| 29. | Эканамічная кібернетыка | 1,7 | 2,05 |
| 30. | Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве | - | 3,3 |
| Усяго: | | 2,13 | 2,14 |

# ПАРАДАК

## УДЗЕЛУ АБІТУРЫЕНТАЎ У КОНКУРСЕ 1999 ГОДА

**1. Без уступных экзаменаў:**

— пераможцы (І, ІІ, ІІІ месца) міжнародных, рэспубліканскіх, абласных алімпіяд выпускнікоў школ і педвучылішчаў, праведзеных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1998/99 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, а таксама алімпіяд, якія праводзіў ГрДУ ў 1999 годзе — пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці;

— пераможцы і прызёры Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў Свету, Еўропы і Рэспублікі Беларусь пры паступленні на спецыяльнасць "Фізічная культура і спорт" пры станоўчай здачы няпрофільнага экзамена па плаванні.

**2. Па мэтавым прыёме выпускнікоў 1999 года СШ сельскай мясцовасці на дзённую форму навучання:**

— па выніках субседавання па вызначаных прафіліруючых прадметах — медалісты;

— па выніках экзаменаў — усе астатнія і медалісты, якія не рэкамендаваны да залічэння па выніках субседавання.

**3. Па-за конкурсам:**

— воіны-інтэрнацыяналісты;

— дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў;

— дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, або рабочых і служачых, што займалі штатныя пасады ў воінскіх часцях, загінуўшых (памерлых) ці стаўшых інвалідамі падчас праходжання ваеннай службы або працы ў складзе савецкіх войск на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, загінуўшых (памерлых) у мірны час пры праходжанні ваеннай службы;

— дзеці з сем'яў асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, загінуўшых (памерлых) або стаўшых інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама загінуўшых (памерлых) у мірны час пры выкананні службовых абавязкаў;

— інваліды І і ІІ груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ва універсітэце па абранай спецыяльнасці і якія могуць наведваць заняткі;

— абітурыенты, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 18 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» /Вед.ВС, 1991 г., №20, арт.292/; абітурыенты гэтай катэгорыі, якія скончылі навучальныя ўстановы з адзнакай (з выдатнымі адзнакамі), залічваюцца па выніках субседавання;

— суайчыннікі з іншых краін па рэкамендацыях беларускіх суполак і навучальных устаноў замежжа на спецыяльна выдзеленыя месцы.

**4. Абітурыенты, якія маюць медаль або дыплом з адзнакай і здалі экзамены па прафіліруючых прадметах на 5 (пяць).**

**5. Па агульным конкурсе:**

— усе астатнія ў адпаведнасці з колькасцю балаў, якія набралі на ўступных экзаменах.

Пераважнае права на залічэнне пры іншых роўных умовах маюць інваліды ІІІ групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў і асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 19, 20, 23, 24, 25 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС»; звольненыя ў запас ваеннаслужачыя, якія маюць ільготы, устаноўленыя заканадаўствам, і рэкамендацыі воінскіх часцей; асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух гадоў.

**Прыёмная камісія.**

**Институт повышения квалификации и переподготовки руководящих работников и специалистов при Гродненском государственном университете имени Янки Купалы**

**ОБЪЯВЛЯЕТ**

*набор слушателей с высшим образованием и студентов старших курсов*

**на вечернюю или заочную форму обучения по специальностям:**

***Иностранный язык*** *(преподаватель иностранного языка) — 2 года*

***Современный иностранный язык*** *(референт-переводчик) — 1 год*

***Иностранный язык*** *(учитель иностранного языка базовой школы) — 1 год*

***Метрология, стандартизация и сертификация*** *(инженер-метролог или инженер по стандартизации и качеству) — 2 года*

***Технология и оборудование высокоэффективных процессов обработки материалов*** *(инженер-механик) — 2 года*

***Прикладная математика*** *(математик-программист, преподаватель математики и информатики) — 1 год*

***Культурология*** *(культуролог, преподаватель культурологии) — 1,5 года*

***Политология*** *(политолог, преподаватель политологии и социально-политических дисциплин) — 1,5 года*

***Экология*** *(эколог) -1,5 года*

***Психология*** *(психология, преподаватель-психолог) — 2 года*

***Коммерческая деятельность*** *(экономист-менеджер) — 2 года*

***Бухгалтерский учет, анализ, аудит*** *(экономист) — 2 года*

***Финансы и кредит*** *(экономист) — 2 года*

***Правоведение*** *(юрист) — 2,5 года*

ДОВЕРЬТЕ СВОЕ ОБУЧЕНИЕ ПРОФЕССИОНАЛАМ

**г. Гродно, ул. Свердлова, 11. ☎ 75-77-57, 44-75-15, 75-20-74.**

